# Здоровьесберегающие образовательные технологии в учебном процессе

# Фрагмент занятия «Сфера услуг, её структура и роль в экономике. География торговли, ИКТ-технологий, финансовой деятельности»

*(учебный предмет «География», IX класс)*

Мингилевич Валентина Юльяновна,
учитель географии
государственного учреждения образования
«Клайшанская базовая школа»

ТЫП УРОКА: урок абароны праектаў.

МЭТА: фарміраванне ўяўлення аб структуры сферы паслуг, ролі сферы паслуг у эканоміцы Беларусі, аб асаблівасцях развіцця і фактарах размяшчэння гандлю, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, фінансавых паслуг.

ЗАДАЧЫ:

пазнаёміць са структурай сферы паслуг, з асаблівасцямі развіцця і фактарах размяшчэння гандлю, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, фінансавых паслуг;

садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення, умення даказваць свой пункт гледжання;

садзейнічаць выхаванню пачуцця патрыятызму, камунікатыўнасці.



Вучні павінны:

- ведаць паняцці : інфармацыя і сувязь, фінансавая дзейнасць, асаблівасці развіцця і фактары размяшчэння асобных галін сферы паслуг;
- умець тлумачыць прычыны адрозненняў ва ўзроўні развіцця сферы паслуг, паказчыкі і асаблівасці развіцця і размяшчэння гандлю, інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, фінансавых паслуг;

Метады навучання: славесны, наглядны, практычны.

Формы дзейнасці вучняў: індывідуальная, франтальная, групавая.

ФРАГМЕНТ УРОКА

Педагог: Як было сказана ў пачатку ўрока, у нас сёння незвычайны ўрок – урок абароны праектаў, да якога вы даволі доўга рыхтаваліся і зараз вам прадставіцца магчымасць абараніць гэтыя праеты.

Пры выступленні груп будзьце вельмі ўважлівыя. Слухаючы праекты вам неабходна будзе выканаць заданне, патрэбна ўстанавіць паслядоўнасць у кожным алгарытме, а затым патрэбна будзе выбраць неабходныя інфарм-карткі да кожнага праекта. Пры правільных выбарах картак, у канцы ўрока вы зможаце сабраць інфарм-брэлок адпаведна алгарытму.



Пераходзім да абароны праектаў.

У структуры відаў эканамічнай дзейнасці вялікая ўдзельная вага гандлю, бытавых і дзелавых паслуг, таму паслухаем першы праект па пытанню “Гандаль у Беларусі”.

<u>АБАРОНА ПРАЕКТА “ГАНДАЛЬ У БЕЛАРУСІ”</u>

Творчы праект-фуршэт (панарама+карта, гексаганальная схема, додакаэдр, дом-рэклама “Купляйце беларускае і будзеце здаровы!”)




*Мы прапаноўваем вам творчы праект, мэта якога была вывучыць, прааналізаваць, структурыраваць тэарытычны матэрыял па тэме “Гандаль у Беларусі” і на аснове яго распрацаваць шэраг заданняў для выкарыстання ў далейшым.*

*Мы вас запрашаем на фуршэт “Гандаль у Беларусі”. На фуршэце мы вам прапаноўваем:*

- *Тэарэтычны матэрыял у выглядзе Панарамы*
- *Гексаганальную схему “Віды гандлю”*
- *Додакаэдр “Сеткавы гандаль”*
- *Дом – рэкламу “Купляйце-беларускае і будзеце здаровы”*

*<u>Тэарэтычны матэрыял у выглядзе Панарамы</u>*

*Гандаль – гэта адзін з найстарэйшых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг, які інтэрсіўна развіваецца ў Беларусі. У сферы паслуг удзельная вага гандлю ў валавым унутраным прадукце Беларусі самая высокая і складае 9,7%, змяняючыся па рэгіёнах краіны. Самая нізкая ўдзельная вага гандлю ў Магілёўскай вобласці – 8,3%. Самая высокая ўдзельная вага гандлю ў Мінску – 19,4%.*

*Доля прыватнай уласнасці у рознічным таваразвароце – больш за 75%. У агульнай колькасці тавараў, прададзеных праз магазіны, пераважаюць харчовыя–55%. Рознічны таваразварот залежыць ад узроўню даходаў насельніцтва, таму лепей развіты у буйных гарадах: у Мінскім, Салігорскім, Полацкім раёнах.*

*У Беларусі хуткімі тэмпамі развіваецца сеткавы гандаль, які, як правіла, канцэнтруецца ў буйных гарадах з большай пакупной здольнасцю. Але ў апошнія гады сеткавы гандаль ахоплівае і сельскую мясцовасць, дзе сетка "Еўраопт" адкрыла ўжо больш за 700 магазінаў. У сеткавых магазінах прадаюцца як харчовыя, так і прамысловыя тавары. Хуткімі тэмпамі пашыраецца сетка Інтэрнэт – магазінаў, расце іх тавараззварот. Магазіны ўкараняюць сістэму зніжак, розныя рэкламныя акцыі, сістэму дастаўкі тавараў і іншае.*

*Гексаганальная схема "Віды гандлю"*

*Разгледзім віды гандлю. Гандаль падзяляецаа на аптовы і рознічны. У цяперашні час аптовы гандаль уключае больш за 15тысяч арганізацый і больш за 9000 спецыялізаваных складскіх памяшканняў, да якіх адносяцца склады-мазазіны, склады-халадзільнікі і гародненасховішчы. Рознічны ганадль набліжаны да месцаў пражывання людзей і мае разгалінаваную сетку. Для размяшчэння аб'ектаў гандлю важнай з'яўляецца крокавая даступнасць. Колькасць прадпрыемстваў рознічнага гандлю ў 2017 годзе перавысіла 54000. Доля прыватнай уласнасці ў рознічным тавараззвароце складае больш 75%. У агульнай колькасці тавараў пераважаюць харчовыя – каля 55%. Гандлёвыя плошчы таксама выраслі ў 2 разы. Гэта звязана з павелічэннем асартыменту тавараў.*

*Додакаэдр "Сеткавы гандаль"*

*Перад вамі додакаэдр "Сеткавы гандаль". На верхнім полі "гандлёвыя сеткі", дзе мы падабралі самыя вядомыя гандлёвыя магазіны. На ніжнім полі Інтэрнэт – сеткі і самыя вядомыя Інтэрнэт – магазіны. Усе элементы здымаюцца, іх можна замяніць на іншыя. У додакаэдр можна гуляць, як у мячык. Таму, што выпадзе, той пра гэта і распавядае. На ім можна размяшчаць іншыя заданні , напрыклад, пытанні "А што гэта?", "Якое гэта паняцце?" і іншае.*



*Дом – рэклама “Купляйце-беларускае і будзеце здаровы”*

*Ну які ж гандаль без рэкламы?*

*У якасці рэкламы мы вам прапануем дом “Купляйце беларускае і будзеце здаровы”.*

*У нашым доме 4 пакоі : гасцеўня, спальня, кухня і душавая.*

*У афармленні гасцеўні мы вам прапануем выкарыстоўваць такія беларускія брэнды як:*

*“Пінскдрэў”- гэта лепшая беларуская мэбля, з натуральнага дрэва,з уласных лясных масіваў фабрыкі.*

*Таксама можна набыць мэблю “Маладзечна мэбля”, асноўным напрамкам якога з'яўляецца стварэнне мяккай мэблі.*

*Яшчэ ў гасцеўню мы памяшчаем тэлевізары – брэнда “Гарызонт”, буйнейшага вытворцу і экспарту каўроў “Віцебскія каўры”, ну і посуд арганізацыі са шматгадовымі традыцыямі шкловарэння “Неман”.*




*Пераходзім у спальню! Яшчэ адзін брэнд – вытворца мэблі “Гомельдрэў”. “Белсветаімпарт” нам дапаможа ў выбары свяцільнікаў.*

*На выбар можна выбраць высокаякасныя артапедычныя матрасы такіх брэндаў, як “Вегас”,”Кондар”. Ну а найбуйнейшыя вытворцы тэкстылю ў Рэспубліцы Беларусь - гэта “Блакіт”. Пасцельная бялізна со 100% бавоўны, бязь,сацін, жаккарда.*

*Далей адпраўляемся ў кухню,дзе напэўна кожны з вас справодзіць даволі часу. Таму пачнем з тэлевізара “Віцязь”. Гэта прадпрыемства – буйны вытворца тэлезійнай тэхнікі і бытавой электронікі. Выпускам сучаснай кухоннай бытавой тэхнікі займаецца брэнд “Гефест”, выпускае газавыя электрычныя пліты. Якая ж кухня без халадзільнага абсталявання, і тут нам дапаможа добра вядомы брэнд “Атлант”. Ну а посуд і фарфор мы можам набыць у лідарах дадзенай вытворчасці “Добрушскі фарфоравы завод”.*

*Ну а зараз у душавую! Брэнд "Бярозакераміка" наш дапаможа у выбары керамічнай пліткі, а брэнд "Керамін", які выпускае больш за 1.500.000 вырабаў, у выбары не толькі пліткі, але і сантэхнікі.*

*Такім чынам, мы вас запрашаем "Купляйце беларускае і будзеце здаровы!" Ну а наш дом можна выкарыстоўваць не толькі ў якасці рэкламы, але і ў якасці заданняў, паколькі ўсе элементы здымаюцца!*

*Тут жа вы зможаце прачытаць больш падрабязную інфармацыю аб брэндах Беларусі.*

*Такім чынам, мы прыйшлі да высновы, што гандаль адзін з галўных відаў сферы паслуг.*

*Вялікі дзякуй за ўвагу!!!*

Педагог: Як вы думаеце, дзе ў далейшым можна будзе выкарыстоўваць заданні, што вы распрацавалі?

Вывад….Такім чынам…

ФІЗКУЛЬТПАУЗА "БЕЛАРУСКІЯ БРЭНДЫ СА СМАКАМ"

Педагог: А зараз павярніцеся направа. Я буду называць лагатып фабрыкі, а вы павінны толькі вачамі знайсці гэты лагатып, а таксама прадукцыю, якую выпускае дадзеная фабрыка.

Педагог: А зараз, калі ласка, устаньце, падыдзіце да стала і выберыце інфарм-карткі, якія адносяцца да пытання "Гандаль у Беларусі".

Педагог: Пераходзім да абароны другога праекта па пытанню "Інфармацыя і сувязь".

АБАРОНА ПРАЕКТА "ІНФАРМАЦЫЯ І СУВЯЗЬ"

*Мы прадстаўляем інфармацыйны праект па пытанню інфармацыя і сувязь "Новыя гарызонты доступу".*

*Мэта праекта: вывучыць тэарытычны матэрыял па тэме "Інфармацыя і сувязь", прааналізаваць і структурыраваць яго і прадставіць ў выглядзе Book Creator.*

*Першае, што мы разглядаем, гэта сутнасць паняцця інфармацыя і сувязь, структура ІКТ.*

*Інфармацыя і сувязь – гэта від эканамічнай дзейнасці па стварэнні і распаўсюджванні інфармацыйных матэрыялаў, ажыцяўленні тэлекамунікацый, прымяненні інфармацыйных тэхналогій і інфармацыйным абслугоўванні.*

*Перад вамі гексаганальная схема структуры ІКТ, да якой адносяцца: выдавецкая дзейнасць, вытворчасць і ажыцяўленне тэле- і радыё вяшчання, падрыхтоўка кіна- і відэафільмаў, тэлекамунікацыйная дзейнасць.*

*На долю ІКТ прыходзіцца больш за 5 % ВУП.*

*Далей мы прадстаўляем сучасны стан інфармацыйных і камунікацыйных сістэм у Беларусі. Беларусь па індэксе развіцця ІКТ займае 32-ю пазіцыю ў свеце, з'яўляецца лідарам сярод краін СНД.*

*Доля экспарту камп'ютарных паслуг у 2017 г. склала больш за 15%.*

*Таксама з поспехам на сусветны рынак выйшла распрацаваная ў Беларусі гульня "World of Tanks". У электронай кнізе мы размясцілі ссылку на сайт гульні, менавіта некаторым з вас яна ўжо знаёмая.*

*Далей разгледзім Парк высокіх тэхналогій. Ён займаецца вырашэннем пытанняў інфармацыйнага абслугоўвання насельніцтва.*

*Парк высокіх тэхналогій – адзін з вядучых інавацыйных IT-кластараў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. У 2021 годзе сумарны экспарт ПВТ дасягнуў $ 3,2 млрд. У ПВТ больш за 140 рэзідэнтаў, адныя з іх: БелАбат, Вайбер Медыя, "Гейм Стрым", EPAM Systems, IBA Group.*
*Больш падрабязная інфармацыя пра ПВТ прадстаўлена ў відэа, якое мы прапануем паглядзець.*



*Што тычыцца інфармацыйных паслуг, то вядома, што ІКТ-сфера з'яўляецца адным з ключавых напрамкаў развіцця паслуг Рэспублікі Беларусь. Экспарт камп'ютарных паслуг стаў актыўна развівацца пасля падпісання дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 верасня 2005 года.*

*Тэлекамунікацыйная галіна ўключае ў сябе прадпрыемствы, якія аказваюць паслугі тэлефаніі, тэле - і радыёвяшчання, мабільнага і стацыянарнага доступу да сеткі Інтэрнэт.*

*У краіне актыўна выкарыстоўваюцца развітыя мультысэрвісныя сеткі электрасувязі і сэрвісы на базе IMS-платформы. Дынамічна развіваецца рынак паслуг паштовай сувязі. Сетка паштовай сувязі налічвае больш за 4 тысяч аб'ектаў.*

*Прапануем разглядзець "Белтелекам". РУП"Белтэлекам" — аператар Рэспублікі Беларусь па прадастаўленні паслуг электрасувязі. Структура характарызуецца наяўнасцю 9 філіялаў і 3 прадпрыемстваў. Акрамя брэнда "Белтэлекам" кампанія валодае і іншымі: byfly, ZALA, Ясна, ЯСНАе TV. За дасягненне ў 2023 годзе прызнаны пераможцам спаборніцтва і занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару.*

*Цяпер прапануем разглядзець пытанн:е Міжнароднае супрацоўніцтва Беларусі ў галіне інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій. Для Беларусі міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне ІКТ з'яўляецца важным фактарам развіцця і павышэння канкурэнтаздольнасці. Беларусь ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне ІКТ па наступных асноўных напрамках: распрацоўка і рэалізацыя сумесных праектаў; абмен вопытам і лепшымі практыкамі ў галіне цыфравізацыі, садзейнічанне развіццю інавацый і стартапаў, падрыхтоўка кадраў, рэгуляванне дзейнасці.*

*Беларусь актыўна абменьваецца вопытам з іншымі краінамі. Асноўнымі партнёрамі з'яўляюцца: Расія, Кітай, Індыя. Абмен вопытам ажыццяўляецца ў розных фарматах. Перспектывы міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі звязаны з развіццём новых тэхналогій, такіх як штучны інтэлект, Блокчэйн, Інтэрнэт рэчаў.*

*Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі ў гэтых галінах. На сайце Міністэрства сувязі і інфарматызацыі прадстаўлены звесткі аб супрацоўніцтве. У выглядзе табліцы прадстаўлена міжнароднае супрацоўніства з 1993 па 2023 год.*

*Мы распрацавалі рэкамендацыі па далейшым развіцці інфармацыйных і камунікацыйных сістэм у Беларусі:*

*-Надаць асаблівую ўвагу забеспячэнню роўнага доступу да шырокапалоснага Інтэрнэту ва ўсіх населеных пунктах, уключаючы сельскую мясцовасць.*

*-Развіваць электронную адукацыю і ахову здароўя.*

*-Надаць большую увагу інфармацыйнай бяспецы і абароне персанальных дадзеных.*

*-Павысіць якасць і павялічыць хуткасць доступу да Інтэрнэту, асабліва для адукацыі і атрымання дзяржаўных паслуг.*

Педагог: Як вы думаеце, наколькі хутка развіваецца інфармацыя і сувязь? Чаму?

-А як вы лічыце, які ўплыў гэта аказвае на здароўе чалавека?

Вывад….Такім чынам…

Педагог: А зараз, калі ласка, устаньце, падыдзіце да стала і выберыце інфарм-карткі, якія адносяцца да пытання "Інфармацыя і сувязь".Педагог: Сядайце, калі ласка. Вялікі дзякуй нашым гасцям за прысутнасць на ўроку, які яны пакідаюць, а мы з вамі прадоўжым працу…